# ІСПАНА-АМЕРЫКАНСКАЯ ВАЙНА І ЯЕ НАСТУПСТВЫ НА ФІЛІПІНСКІХ БАНКНОТАХ 1974 ГОДА ВЫПУСКУ

**К. А. Місюкевіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*artintellige@gmail.com*
*навук. кір. – С. Ф. Свілас, д-р гіст. навук, проф.*

У дадзенай працы аўтар разглядае адлюстраванне падзей іспана-амерыканскай і філіпіна-амерыканскай войнаў у баністыцы Філіпінаў другой паловы XX ст. Аб’ектам даследвання паслужылі філіпінскія банкноты 1949 г., 1974 г. і 2010 г. выпуску з калекцыі аўтара. Мэта даследвання заключаецца ў вызначэнні ролі падзей і ўдзельнікаў баявых дзеянняў іспана-амерыканскай і філіпіна-амерыканскай войнаў у філіпінскай баністыцы (выпускі банкнот 1949 г., 1974 г. і 2010 г.). На аснове ўласнай баністычнай калекцыі філіпінскіх банкнот 1974 года выпуску вызначана месца падзей і персаналій ваенных канфліктаў, адлюстраваных на філіпінскіх банкнотах.

***Ключавыя словы:*** Філіпіны; баністыка; іспана-амерыканская вайна; філіпіна-амерыканская вайна; філіпінская рэвалюцыя.

Іспана-амерыканская вайна – узброены канфлікт, які адбыўся ў 1898 г. паміж ЗША, кубінскімі і філіпінскімі паўстанцамі, з аднаго боку, і Іспаніяй з іншага. Яшчэ ў 1896 г. на Філіпінах пачаліся масавыя антыіспанскія выступленні, але для канчатковай перамогі краіне бракавала падтрымкі з боку моцнай дзяржавы. Такой дзяржавай сталі ЗША, якія разглядалі Філіпіны як важную крыніцу сыравіны і плацдарм для эканамічнай экспансіі ў азіяцкія краіны. Амерыканскі ўрад абяцаў паспрыяць абвяшчэнні незалежнасці Філіпінаў пасля разгрому іспанцаў, аднак пасля перамогі абяцанне стрымана не было. І калі 12 чэрвеня 1898 г. філіпінцы самі абвясцілі сваю незалежнасць ад Іспаніі, ЗША яе не прызналі, бо па ўмовах Парыжскай мірнай дамовы Філіпіны павінныя былі знаходзіцца пад непасрэдным пратэктаратам Вашынгтона.

Філіпінцы не збіраліся мірыцца з такім становішчам рэчаў, і як след распачалася філіпіна-амерыканская вайна, па выніках якой Філіпіны канчаткова сталі тэрыторыяй, залежнай ад ЗША. Вайна была першай спробай філіпінскага народа ўзяць уладу ў свае рукі і вызваліцца ад гнёту каланіяльных імперый. Аб значнасці гэтых войнаў сведчыць шырокае распаўсюджанне персаналій і сюжэтаў, звязаных з ёй, у баністыцы ўжо незалежных Філіпінаў.

Для баністаў Філіпіны – сапраўды ўнікальная краіна, бо з кожным выпускам банкнот сюжэты на іх ледзь не кардынальна змяняюцца. Найбольшую колькасць сюжэтаў, што маюць дачыненне да іспана-амерыканскай і філіпіна-амерыканскай войнаў, можна знайсці на банкнотах 1949 г. выпуску. На банкнотах 1974 г., якія былі

прааналізаваныя аўтарам, колькасць сюжэтаў па тэме скарацілася амаль удвое. Канешне, на змену ім прыйшлі сюжэты, звязаныя з канчатковым атрыманнем Філіпінамі незалежнасці, то бок з больш актуальнымі падзеямі філіпінскай гісторыі. У наступнай табліцы аўтар вылучае банкноты з выявамі персаналій і падзей, якія маюць непасрэднае дачыненне да ўзгаданых войнаў. Можна заўважыць, што гэтым тэмам прысвечана каля паловы банкнот, што, безумоўна, яшчэ раз сведчыць аб іх вялікім значэнні для філіпінскага народу.

Разглядзім больш дэтальна выявы на банкнотах у 1, 5 і 10 песа. На пярэднім баку банкноты з самым малым наміналам у выпуску знаходзіцца выява Хасэ Рысаля (1861–1896). Да ўласна падзей іспана-амерыканскай вайны ён не мае дачынення, бо быў забіты іспанскімі каланізатарамі яшчэ раней, але унёс вялікі ўклад у падрыхтоўку тэарэтычнай базы Філіпінскай рэвалюцыі, за што яго нават празвалі «першым філіпінцам» і «гонарам малайскай расы». На адваротным баку банкноты размешчана выява, якая адлюстроўвае пераломны момант гісторыі краіны і разам з тым падставу для пачатку філіпіна-амерыканскай вайны – прыняцце Дэкларацыі незалежнасці Філіпінаў ад Іспаніі 12 чэрвеня 1898 г.

На наступнай банкноце наміналам у 5 песа мы бачым партрэт аднаго з галоўных дзеячаў рэвалюцыі і першапачаткова яе лідара Андрэса Баніфасіа (1863–1897). Ён таксама з'яўляўся лідарам радыкальнай арганізацыі Катыпунан, якая дамагалася вызвалення Філіпінаў любымі сродкамі. На дадзенай банкноце назіраецца прамая сувязь паміж выявамі на пярэднім і адваротным баках: ззаду бачым выяву той самай арганізацыі Катыпунан, якую ўзначаліў Баніфасіа. Углядаючыся пільна, можна заўважыць таксама паперу і чарніла, бо Баніфасіа быў не толькі дзеячам рэвалюцыі, але і пісьменнікам.

Апошняй банкнотай, звязанай з тэмай наступстваў іспана-амерыканскай і філіпіна-амерыканскай войнаў, ёсць 10 песа з выявай першага ў гісторыі Філіпінаў міністра замежных спраў Апалінарыа Мабіні (1864–1903), які сыграў вялікую ролю ў перамовах з амерыканцамі па спыненні баявых дзеянняў. Улічваючы тое, што філіпінская баністыка схільная да моцнага сімвалізму, можна дапусціць, што выява царквы на адваротным баку банкноты – не выпадковасць. Па меркаванні аўтара, гэта звязана з тым, што спачатку Мабіні меў намер стаць святаром і не раз прызнаваўся, што Бог шмат значыць у яго жыцці.

Такім чынам, сюжэты, звязаныя з іспана-амерыканскай і філіпіна-амерыканскімі войнамі, з'яўляюцца даволі распаўсюджанымі ў выпуску філіпінскіх банкнот 1974 г., што сведчыць аб іх вялікім значэнні для гісторыі краіны, нават нягледзячы на тое, што незалежнасці філіпінцы

на той час не дабіліся. Варта адзначыць, што і на сённяшні дзень сюжэты не страцілі актуальнасць, хаця іх колькасць у выпуску 2010 г., якім краіна карыстаецца дагэтуль, значна абмежаваная, і сюжэты па тэме прадстаўленыя толькі на банкнотах з самым маленькім наміналам.

**Библиографические ссылки:**


1. *Губер, А. А.* Филиппинская республика 1898 г. и американский империализм. М., 1961.
2. *Жилинский, Я. Г. Испано-американская война. СПб., 1899.*
3. *Подберезский, И. В. Хосе Рисаль. М., 1985.*